www.Belarus-Live.eu

BELARUS Live

NEWSLETTER
07/03-13/03/08

**ПАЛІТЫКА**
▪Амбасадарка ЗША пакідае Беларусь
▪Ці ЗША ўвялі новыя эканамічныя санкцыі?

**АФІЦЫЙНА**
▪Беларусі ня вернуць прэфэрэнцыяў Эўразьвязу
▪Узяць пад кантроль інтэрнэт

**АПАЗЫЦЫЯ**
▪АГП не даюць месца для правядзеньня зьезду
▪Галадоўка братоў

**ЭКАНОМІКА**
▪Эканоміка Беларусі разьвіваецца?
▪Расея адмаўляецца ад субсыдаваньня Беларусі

**ГРАМАДЗТВА**
▪"Жывы шчыт" на беларускіх дарогах

**КУЛЬТУРА**
▪Выйшаў "Эўраслоўнік" Лявона Баршчэўскага

Галоўнай палітычнай падзеяй апошніх дзён для Беларусі стаў дыпляматычны канфлікт афіцыйнага Менску з Вашынгтонам.

7 сакавіка беларускае кіраўніцтва адклікала дзеля кансультацыяў амбасадара ў ЗША Міхаіла Хвастова і парэкамэндавала амэрыканскаму боку адклікаць з аналягічнай мэтай сваю амбасадарку ў Менску Карэн Сьцюарт. У заяве МЗС Беларусі дэмарш быў патлумачаны тым, што напярэдадні ЗША пашырылі дзеяньне эканамічных санкцыяў супраць канцэрну "Белнафтахім", уведзеных у лістападзе летась.

Паколькі спн. Сьцюарт не была абвешчаная пэрсонай нон грата, Вашынгтон напачатку вырашыў пакінуць яе ў Менску. Такім чынам заставалася поле для хутчэйшага кампрамісу. Але 12 сакавіка пасьля паўторнай "настойлівай рэкамэндацыі", выказанай беларускім МЗС, кіраўніца дыпляматычнай місіі ЗША мусіла часова зьехаць зь Беларусі.

Зь іншага боку, намесьнік дзяржсакратара ЗША Дэвід Крэмэр завастрыў пазыцыю сваёй краіны, пэрсаналізаваў галоўнае патрабаваньне да беларускіх уладаў. Ён заявіў, што амэрыканцы ня сядуць за стол перамоваў, пакуль ня будзе вызвалены Аляксандар Казулін (гэтага былога канкурэнта Аляксандра Лукашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах Захад лічыць галоўным палітычным вязьнем беларускага рэжыму).

Такім чынам, адбылася эскаляцыя канфлікту. Фактычна беларускае кіраўніцтва зьдзейсьніла пагрозу, якая прагучала з вуснаў Аляксандра Лукашэнкі яшчэ ў сьнежні: "вышпурнуць" амбасадарку ў выпадку ўзмацненьня санкцыяў. Амэрыка ж, даўшы 6 сакавіка пашыральную трактоўку ранейшых санкцый, таксама пайшла на прынцып, даючы зразумець, што не прымае палавіністых варыянтаў у пытаньні палітвязьняў.

Абвастрэньне канфлікту з Вашынгтонам, адзначаюць незалежныя аналітыкі, можа зьвесьці на нішто ўсе папярэднія захады беларускага боку дзеля паляпшэньня стасункаў з Захадам. За апошнія месяцы былі вызвалены амаль што ўсе асобы, якія фігуравалі ў ягоным сьпісе як палітычныя зьняволеныя. Здавалася б, яшчэ адзін крок — і адбудзецца дыпляматычны прарыў, так патрэбны беларускаму боку ў зьвязку з расейскім ціскам.

Але, на думку экспэртаў, у беларускай кіроўнай вярхоўкі спрацавала іншая лёгіка.

Па-першае, у гульні з Захадам Казулін разглядаецца як казырны туз, варты таго, каб яго прытрымаць.

Па-другое, гэта самы небясьпечны палітычны праціўнік дзейнай улады, які звыш таго ёсьць асабістым ворагам прэзыдэнта, і тут ужо спрацоўвае псыхалягічны, эмацыйны чыньнік.

Па-трэцяе, улада надта ня хоча падацца слабой у вачох электарату. Саступка ў выглядзе вызваленьня "палітвязьня №1" можа быць успрынятая грамадзянамі як праява слабасьці кіраўніцтва. Зь іншага боку, гэта натхніць палітычную апазыцыю. Калі Казулін выходзіць на волю зь іміджам маральнага пераможцы, то магчымае гуртаваньне апазыцыйных сілаў вакол ягонай асобы, пашырэньне іх уплыву на масы, а у выніку — разгойдваньне сытуацыі ў краіне.

Абвастраючы стасункі з Вашынгтонам праз нежаданьне вызваліць Казуліна, Менск разьлічвае, на думку шэрагу экспэртаў, убіць клін між ЗША і Эўразьвязам у падыходзе да "беларускага пытаньня". Краіны ЭЗ непараўнальна мацней зьнітаваныя зь Беларусьсю эканамічнымі, і ў прыватнасьці транзытнымі, інтарэсамі. Таму ў дачыненьнях зь ёю Брусэль схільны прытрымліваецца болей мяккай, лагоднай лініі. Паказальна, што 7 сакавіка, у адзін дзень з дэмаршам Менску супраць ЗША, у Брусэлі адбылося падпісаньне пагадненьня аб адкрыцьці ў беларускай сталіцы прадстаўніцтва Эўракамісіі. А 10 сакавіка, прымаючы дэлегацыю брытанскіх дзелавых колаў, Аляксандар Лукашэнка выказаў спадзеў, што Эўропа выявіць самастойную, адрозную ад амэрыканскай, пазыцыю ў дачыненьні да Беларусі.

Зь іншага боку, у беларускага кіраўніцтва ёсьць спадзеў на падтрымку Масквы, якая мае свой сьпіс прэтэнзій да палітыкі ЗША (пытаньні Косава, разьмяшчэньня элемэнтаў супрацьракетнай абароны ў Эўропе ды інш.). Назіральнікі зьвярнулі ўвагу на тое, што дэмарш супраць Вашынгтону Менск зрабіў на другі дзень пасьля тэлефоннай размовы Аляксандра Лукашэнкі з Уладзімерам Пуціным. Падчас гутаркі, як падкрэсьліла прэсавая служба беларускага прэзыдэнта, два лідэры абмеркавалі "стан і пэрспэктывы разьвіцьця дачыненьняў Беларусі з асобнымі заходнімі дзяржавамі".

Як адзначае беларускі палітоляг Андрэй Фёдараў, эскаляцыя канфлікту Беларусі з Захадам выгадная Крамлю, бо чым мацнейшая канфрантацыя, тым болей беларускае кіраўніцтва будзе хіліцца ў бок Масквы. Што, у сваю чаргу, падвышае яе шанцы накінуць свае ўмовы закабаленьня (увядзеньне расейскага рубля ў якасьці адзінай валюты дзьвюх краін, падпісаньне Канстытуцыйнага акту так званай саюзнай дзяржавы, выкарыстаньне "беларускага пляцдарму" дзеля "асымэтрычнага адказу" на меркаванае разьмяшчэньне амэрыканскіх супрацьракетаў у Польшчы ды радару ў Чэхіі).

Афіцыйнаму Менску, які ня хоча інкарпарацыі краіны ў склад Расеі, застаецца толькі доўжыць манэўраваньне між Усходам і Захадам. На думку экспэртаў, беларускае кіраўніцтва наўрад ці пойдзе на поўны разрыў стасункаў з ЗША. Праз нейкі час бакі ўсё адно мусяць сесьці за стол перамоваў.

---

# ПАЛІТЫКА

## Амбасадарка ЗША пакідае Беларусь

**Амбасадарка Злучаных Штатаў Амэрыкі Карэн Сьцюарт на сёньняшняй сустрэчы з прадстаўнікамі беларускай апазыцыі паведаміла, што выяжджае зь Менску ў Вашынгтон на кароткачасовыя кансультацыі. Пра гэта паведамляе "Наша Ніва".**

Падчас размовы зь дзеячамі апазыцыі кіраўніца дыпмісіі падкрэсьліла, што палітыка Вашынгтону ў дачыненьні да Беларусі ня зьменіцца.

Як паведамлялася, у мінулую пятніцу беларускія ўлады адклікалі з Вашынгтону амбасадара Міхаіла Хвастова. Тое ж самае МЗС Беларусі рэкамэндаваў зрабіць і амэрыканскаму боку.

Беларуска-амэрыканскае дыпляматычнае напружаньне зьвязана з санкцыямі, уведзенымі ЗША ў адносінах да канцэрну "Белнафтахім".

## Ці ЗША ўвялі новыя эканамічныя санкцыі?

**На мінулым тыдні Міністэрства фінансаў ЗША растлумачыла ўжыцьцё санкцыяў, уведзеных супраць дзяржаўнага канцэрну "Белнафтахім" у лістападзе мінулага году.**

Згодна з дакумэнтам, блякаваньне актываў і забарона на зьдзелкі з канцэрнам распаўсюджваецца на ўсе падразьдзяленьні канцэрну й кампаніі, у якіх "Белнафтахім" валодае прынамсі паловай маёмасьці.

Гэта была тэхнічная канкрэтызацыя ўжо ўведзеных санкцыяў, але Менск інтэрпрэтаваў яе як новыя карныя крокі ў адносінах да Беларусі. Магчыма таму, што яна дазваляе больш шырока тлумачыць сьпіс фірмаў, зьвязаных з "Белнафтахімам".У адказ на санкцыі быў адкліканы амбасадар Беларусі ў ЗША Міхаіл Хвастоў, а амбасадарка ЗША ў Менску Карэн Сьцюарт атрымала рэкамэндацыі выехаць зь Беларусі. Аднак амэрыканскі бок вырашыў пакінуць сваю прадстаўніцу ў Менску.

# АФІЦЫЙНА

## Беларусі ня вернуць прэфэрэнцыяў Эўразьвязу

**Пры самым аптымістычным прагнозе гэта магчыма не раней чым у 2009 годзе — заявіў намесьнік міністра замежных справаў РБ Андрэй Еўдачэнка.**

Гэтае пытаньне закранапася на паседжаньні дзелавога савету Беларусь-Эўразьвяз у Менску.

Нават пры ўмове, што ўсе краіны ЭЗ будуць згодныя зь вяртаньнем Беларусі прэфэрэнцыяў, на гэта неабходны час.

Нагадаем, Эўрапейская камісія адмяніла агульную сыстэму прэфэрэнцыяў ЭЗ у адносінах да Беларусі ў 2007 годзе, па рэкамэндацыі Міжнароднай арганізацыі працы (МАП) за парушэньне правоў прафсаюзаў.

## Узяць пад кантроль інтэрнэт

**Беларускія ўлады плянуюць унесьці папраўкі ў дзейныя законы з мэтаю кантраляваньня інтэрнэту. Першая намесьніца міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч заявіла, што адказнасьць за распаўсюд інфармацыі ў інтэрнэт-СМІ павінна быць такой жа самай, што й друкаваных СМІ, асабліва калі парталы ня чыста рэклямныя, а маюць інфармацыйны й аналітычны блёк.**

Пры гэтым Лілія Ананіч прызнала, што інтэрнэт — "складаны сэгмэнт інфармацыйнага поля". Яго цяжка пракантраляваць і зарэгістраваць. Для рэгуляваньня дзейнасьці інтэрнэт-СМІ могуць быць унесеныя папраўкі ў дзейныя законы або прыняты новы нарматыўны акт.

# АПАЗЫЦЫЯ

## АГП не даюць месца для правядзеньня зьезду

**Прэс-служба Аб’яднанай грамадзянскай партыі паведамляе, што да гэтага часу не ўдалося знайсьці памяшканьня для правядзеньня партыйнага зьезду, запланаванага на 20 красавіка.**

Ужо больш за дзесяць розных установаў адмовіліся вылучыць памяшканьне, спасылаючыся на розныя прычыны, а часам наагул не абгрунтоўваючы свайго рашэньня.

Лідэр АГП Анатоль Лябедзька, камэнтуючы адмовы, падкрэсьліў, што ў Беларусі нават тэхнічныя пытаньні вырашаюцца на палітычным узроўні. Ніводная ўстанова без дазволу Адміністрацыі прэзыдэнта ня дасьць згоды на правядзеньне партыйнага сходу.

## Галадоўка братоў

**Сяргей і Аляксандар Скрабцы абвесьцілі сёньня бестэрміновую галадоўку. Такім чынам браты дамагаюцца вызваленьня палітвязьняў Аляксандра Казуліна, Сяргея Парсюкевіча й Андрэя Кіма.**

Пакуль што галадаць будуць толькі ўдвух, але Сяргей Скрабец упэўнены, што іх падтрымаюць іншыя грамадзкія дзеячы. "Цяпер, калі ЗША й Эўразьвяз адзінагалосна патрабуюць вызваленьня беларускіх палітвязьняў, мы вырашылі, што неабходна далучыцца да гэтых патрабаваньняў", — лічыць былы дэпутат беларускага парлямэнту.

Для былога палітвязьня Сяргея Скрабца гэта ўжо ня першая галадоўка. Перад сваім вызваленьнем зь віцебскай турмы ён адмаўляўся ад ежы амаль 25 дзён — у знак салідарнасьці з Аляксандрам Казуліным. Браты заявілі, што будуць галадаць актыўна, напрыклад, возьмуць удзел у сьвяткаваньні Дня Волі.

# ЭКАНОМІКА

## Эканоміка Беларусі разьвіваецца?

**Унутраны валавы прадукт Беларусі ў студзені-лютым вырас на 9,9%, а прамысловая вытворчасьць — на 12,9%. Акрамя таго, аб’ём выпуску сельскагаспадарчай прадукцыі павялічыўся больш чым на 6%, а інвэстыцыі ў асноўны капітал — на 12,1%.**

Згаданую інфармацыю агучыў міністар статыстыкі й аналізу Ўладзімер Зіноўскі падчас дакладу прэзыдэнту краіны, паведамляе агенцтва БелаПАН.

Міністар таксама паведаміў прэзыдэнту, што Мінстат актыўна вядзе падрыхтоўку да правядзеньня перапісу насельніцтва ў наступным годзе. У кастрычніку 2007 году быў праведзены пробны перапіс, на аснове вынікаў якога міністэрства падрыхтавала праграму правядзеньня бліжэйшага перапісу насельніцтва.

## Расея адмаўляецца ад субсыдаваньня Беларусі

**Міністэрства фінансаў Расеі прызнае, што падтрымлівала эканоміку Беларусі, і заяўляе, што гэта ўжо мінуўшчына. Пра гэта паведаміў у Дзярждуме намесьнік міністра фінансаў Расейскай Фэдэрацыі Сяргей Шаталаў.**

Беларусь атрымлівала ад Расеі танны расейскі газ і не плаціла мыта за нафту пры перапродажы нафты й нафтапрадуктаў. «За апошнія гады мы гэтыя пытаньні ў значнай ступені адрэгулявалі, прынялі праграму павышэньня цаны газу й вырашылі справу з мытам за нафту», — паведаміў прадстаўнік расейскага Міністэрства фінансаў.

Сяргей Шаталаў ня лічыць таксама даплатай да беларускай эканомікі крэдыт на суму 1,5 мільярда даляраў, які ў сьнежні Расея дала Беларусі на 15 гадоў. Намесьнік міністра фінансаў пацьвердзіў, што

Беларусь абслугоўвае крэдыт салідна й без затрымак.

## ГРАМАДЗТВА

### "Жывы шчыт" на беларускіх дарогах

**Сёньня ў беларускай сталіцы многія кіроўцы далучыліся да акцыі „Жывы шчыт". На вуліцах Менску можна пабачыць аўтамабілі з завязанымі чорнымі й белымі стужкамі.**

Гэта акцыя грамадзкай незадаволенасьці дзеяньнямі супрацоўнікоў ДАІ, якія 2 сакавіка спрабавалі затрымаць п'янага кіроўцу й заблякавалі яму дарогу аўтамабілямі, у якіх знаходзіліся пасажыры.

Пра здарэньне стала вядома літаральна днямі, калі пацярпелыя зьвярнуліся ў пракуратуру. У выніку дзеяньняў даішнікаў, якія чатырма аўтамабілямі перагарадзілі дарогу, пацярпелі чатыры чалавекі й іх транспарт.

Абурэньне сталічных кіроўцаў, якія ініцыявалі акцыю „Жывы шчыт", выклікаў факт, што кіраўніцтва ДАІ абараняе сваіх супрацоўнікоў. Намесьнік начальніка рэспубліканскай ДАІ Ігар Ваніцкі заявіў, што лічыць дзеяньні інспэктараў правільнымі, паколькі іншага шляху спыніць парушальніка не было.

## КУЛЬТУРА

### Выйшаў "Эўраслоўнік" Лявона Баршчэўскага

**У сьвет выйшла новае выданьне — „Эўраслоўнік", аўтарам якога зьяўляецца кандыдат філялягічных навук Лявон Баршчэўскі. У слоўніку зьмешчаныя 100 тысячаў адзінак перакладу на 28 мовах.**

Слоўнік складаецца з чатырох частак. У першай зьмешчаныя беларускія лексычныя адзінкі зь перакладам на 27 моваў сьвету, у гэтым ліку й лацінскую. У другой частцы слоўніка апынуліся запазычаныя словы й выклічнікі. Трэцяя частка — гэта беларуска-лацінскі слоўнік рэлігійных, біялягічных, хімічных і мэдычных тэрмінаў. У чацьвертай частцы зьмешчаныя беларускія прымаўкі й прыказкі.

Назва „Эўраслоўнік" і эўрапейскія сымбалі на вокладцы зьяўляюцца невыпадковымі. Аўтар Лявон Баршчэўскі й рэдактар Уладзімер Сіўчык падкрэсьліваюць, што пры дапамозе „Эўраслоўніка" беларуская мова набліжаецца да патэнцыйных чытачоў беларускіх тэкстаў у эўрапейскіх краінах. А беларусы дзякуючы слоўніку могуць азнаёміцца з багацьцем эўрапейскіх моваў.

---

Belarus live

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай мовай.

European Radio for Belarus

polishaid

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.

Polonia POLSKIE RADIO